# ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ МІФА Ў ВЕРШАВАНЫХ КАЗКАХ У. ДУБОЎКІ

**Л. П. Леська**

*Кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка,*
*вул. Савецкая, 18, 220030, г. Мінск, Беларусь,*
*leska.l.5@ yandex.ru*

У артыкуле даследуецца інтэрпрэтацыя міфа ў вершаваных казках У. Дубоўкі. Адзначаецца, што мастак слова творча засвоіў і пераапрацаваў салярную міфалогію ў аўтарскіх мастацкіх тэкстах.

Заўважана, што ў міфапаэтычным свеце пісьменніка ўзноўлены архаічныя міфалагічныя звесткі пра непадзельнасць існавання ў Сусвеце (казкі «Кветкі-сонцавы дзеткі», «Сонца і певень», «Хто дужэйшы»), вылучаны своеасаблівы пераход ад трансфармацыі міфалагічнай свядомасці да стварэння аўтарскага міфа. Пры ўзнаўленні міфалагічнай свядомасці акцэнтавалася ўвага на ўшанаванні прыродных стыхій і з'яў прыроды, у аўтарскім міфе прадэманстравана паважлівае стаўленне да чалавека, здольнага здзейсніць подзвіг у імя іншых (казка «Як сінячок да сонца лётаў») (у шырокім сусветным аспекце і ў прыватным – праславіць родны край, любае Палессе ( казкі «Хто дужэйшы», «Вожыкаў суд»).

***Ключавыя словы***: У. Дубоўка; міф; міфалагічная свядомасць; салярная міфалогія; інтэрпрэтацыя.

# ИНТЕРПРЕТАЦИЯ МИФА В СТИХОТВОРНЫХ СКАЗКАХ В. ДУБОВКИ

**Л. П. Лесько**

*Кандидат филологических наук, доцент,*
*Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка,*
*ул. Советская, 18, 220030, г. Минск, Беларусь,*
*leska.l.5@yandex.ru*

В статье исследуется интерпретация мифа в стихотворных сказках В. Дубовки. Отмечено, что художник творчески осваивал и перерабатывал солярную мифологию в своих художественных текстах.

Отмечается, что в мифопоэтическом мире писателя воссоздаются архаичные мифологические сведения о неделимости бытия во Вселенной (сказки «Цветы - солнечные дети», «Солнце и петух», «Кто сильнее»), подчеркивается своеобразный переход от трансформации мифологического сознания к созданию авторского мифа. При воссоздании мифологического сознания акцентировалось внимание на почитании природных стихий и явлений природы, авторский миф демонстрировал уважительное отношение к человеку, способному совершить подвиг во имя других (сказка

«Как синяя птица к солнцу летела») (в широком, общечеловеческом аспекте и в частном – прославить родной край, любимое Полесье (сказки «Кто сильнее», «Испытание ёжиков»).

***Ключевые слова***: В. Дубовка; миф; мифологическое сознание; солярная мифология; интерпретация.

## INTERPRETATION OF THE MYTH IN THE POETIC TALES OF V. DUBOVKA

**L. P. Lesko**

*PhD, Ass. Professor,*
*Maxim Tank Belarusian State Pedagogical University,*
*Sovetskaya St., 18, 220030, Minsk, Belarus,*
*leska.l.5@ yandex.ru*

The article explores the interpretation of myth in the poetic tales of V. Dubovka. It is noted that the artist creatively assimilated the word and reworked solar mythology in the author's artistic texts. It is noted that in the mythopoeic world of the writer, archaic mythological information about the indivisibility of existence in the Universe is recreated («flowers are children of the sun», «The Sun and the rooster», «who is stronger»); a peculiar transition from the transformation of mythological consciousness to the creation of the author's myth is highlighted. When recreating the mythological consciousness, attention was focused on honoring the natural elements and natural phenomena, and the author's myth demonstrated respect for a person capable of performing a feat in the name of others (the fairy tale «how a bruise flew to the Sun» (in a wide, bright white.

***Keywords***: V. Dubovka; myth; mythological consciousness; solar mythology interpretation.

Інтэрпрэтацыя міфа ў вершаваных казках У. М. Дубоўкі асэнсоўваецца ўпершыню, хаця праблемы міфапаэтычнага шырока даследуюцца ў беларускім літаратуразнаўстве (В. А. Каваленка, Т. І . Шамякіна, С. І. Даніленка, І. І. Крук).

Мэтазгоднасць асэнсавання заяўленай праблемы абумоўлена тым, што мастацкая вартасць аўтарскіх казак У. М. Дубоўкі высока ацэнена айчыннымі даследчыкамі. Д. І. Бугаёў у манаграфіі «Талент і праца» заўважыў, што У. М. Дубоўка асабліва актыўна чэрпаў з фальклорных крыніц багаты матэрыял. Праца пісьменніка набыла новы размах, стала сістэмнай і дала добры плён. Напісаныя, паводле народных матываў, вершаваныя творы паэта склалі кнігі «Цудоўная знаходка» (1960), «Кветкі – сонцавы дзеткі» (1963), «Казкі» (1968), «Залатыя зярняты» (1975), былі ўключаны ў зборнік «Палеская рапсодыя» і ва ўсе выданні выбраных твораў аўтара і змешчаны ў школьных хрэстаматыях, а такса-

ма друкаваліся ў перакладзе на рускую мову. Асобнымі выданнямі выйшлі казкі «Як сінячок да сонца лётаў» (1961), «Дзівосныя прыгоды» (1963), «Мілавіца» (1964).

У зробленых дубоўкавых апрацоўках, на думку Д. І. Бугаёва, «заўсёды выразна заўважаецца не толькі высокі паэтычны прафесіяналізм, але і бясспрэчная блізкасць аўтара да народнага светаўспрымання» [1, с. 26].

Даследаванне інтэрпрэтацыі міфаў у вершаваных казках У. М. Дубоўкі дасць магчымасць дакладна ўявіць міфалагічнае ядро тэксту, яго генетычную праасноўу.

Актуальнасць вывучэнння міфа, міфічнай свядомасці, міфатворчасці вызначаецца характэрнымі рысамі сучаснага этапу развіцця культуры, такімі яго асаблівасцямі, як крызіс рацыянальнасці і ўзрастання павышанай цікавасці да глыбінных міфалагічных пластоў культуры. Неабходнасць даследавання інтэрпрэтацыі міфа ў вершаваных казках У. М. Дубоўкі звязана з тым, што, нягледзячы на шматвекавыя спробы адкрыць таямніцы міфічнай спадчыны, да нашага часу адсутнічае комплексны накірунак у вывучэнні міфалогіі.

Міф – адзін з цэнтральных феноменаў гісторыі культуры і старажытнасці, спосаб канцэпіравання акаляючай рэчаіснасці і чалавечай сутнасці. Міф – першасная мадэль усякай ідэалогіі, сінкрэтычная калыска не толькі літаратуры, але мастацтва, рэлігіі, у значнай ступені філасофіі і навукі.

Падзеі мінулых стагоддзяў паказалі, што навука не можа, як на тое спадзяваліся пазітывісты XIX ст., поўнасцю выцясніць міфалогію таму, што навука не вырашае такія праблемы, як сэнс жыцця, мэта гісторыі і таямніца смерці; толькі адна міфалогія прэтэндуе на іх вырашэнне. «Галоўная мэта міфа – падтрыманне гармоніі асабістага, сацыяльнага і касмічнага парадку. У міфе прэваліруе пафас пераадолення хаосу і ператварэння яго ў Космас. Усё гэта і з'яўляецца прычынай неканчатковай дэміфалагізацыі, што і забяспечвае захаванне міфалагічнай ментальнасці ў народнай свядомасці» [2, с. 5].

Архаічнай асновай твораў У. М. Дубоўкі, паводле нашага гіпатэтычнага меркавання, стала салярная міфалогія, творчая інтэрпрэтацыя якой вылучаецца ў творах рускай і беларускай літаратуры. Т. І. Шамякіна ў артыкуле «Мифологическое воплощение солнца в русской и белорусской классической литературе» заўважае, што адным з любімых герояў міфалагічнага эпасу – былін і казак – з'яўляецца Уладзімір–Чырвонае сонейка» [3, с. 59]. Язычніцкія гімны сонцу ўвайшлі ў хрысціянскую літаратуру. Творы К. Тураўскага насычаны сонечнай сімволікай, з сонцам звязаны скандынаўскія сагі і гераічны эпас шматлікіх народаў, залатымі эпітэтамі напоўнены і рускія быліны.

Living bachanne... 

быў пакараны. На прыкладзе гэтага міфічнага героя ўшаноўваецца вялікасць яго подзвігу. На працягу значнага прамежку часу лёс Праметэя хваляваў чалавечы розум, набыў розную трактоўку ў літаратуры.

Творчая інтэрпрэтацыя гэтага міфа прадстаўлена ў вершаванай казцы У. М. Дубоўкі «Як сінячок да сонца лётаў», дзе маленькі сінячок, як і славуты Праметэй, таксама імкнецца дапамагчы людзям, накіроўваецца ў дарогу да сонца, бярэ ў яго агонь і нясе на Палессе. У гэтай гісторыі звяртае на сябе ўвагу і смеласць рашучай птушачкі, якая адна з птушак паляцела да сонца, і яе выключная цярплівасць, вытрымка (у час падарожжа сіняк загарэўся, аднак агонь не кінуў, не патушыў яго), і яе няўменне цвяроза ставіцца да вялікай пахвалы (пажар пачаўся з-за таго, што птушыны пасланец, усхваляваны дружным вітаннем, развіў залішнюю хуткасць, «пачаў ляцець стралой»), і здольнасць на спагаду.

У казцы У. М. Дубоўкі ёсць не толькі выразныя згадкі пра славутага Праметэя, тут прыгадваецца і міфічны герой Эпіметэй, які неабачліва страціў усю сваю жыццёвую сілу, таму людзі і жывёлы засталіся безабароннымі. Сінячок, як і міфічны персанаж, неабдумна патраціў сваю сілу, неасцярожна паставіўся да пытання бяспекі свайго падарожжа.

Такім чынам, у вершаваных казках У. М. Дубоўкі мы назіраем своеасаблівы пераход ад узнаўлення аўтарам архаічнай міфалагічнай свядомасці (галоўнымі ўласцівасцямі якой з'яўляюцца непадзельнасць, антрапаморфны характар, анімізм) да паступовага развіцця аўтарскага міфа, дзе пачынаюць фігураваць не толькі элементы архаічнай салярнай міфалогіі, але і яе новыя, асучасненныя міфапаэтычныя рады і вобразы.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Бугаёў Д.* Талент і праца. Літаратурная крытыка. Мінск : Мастацкая літаратура, 1979.

2. *Мелетинский Е. М.* От мифа к литературе Курс лекций «Теория мифа и историческая поэтика. Москва: Российск. гос. гуманит. ун-т, 2000.

3. *Шамякина Т. И.* «Мифологическое воплощение солнца в русской и белорусской классической литературе» // Русская и белорусская литература на рубеже XX-XX1 веков. К 70-летию кафедры русской литературы : сб. науч. ст. В 2 ч. Ч.1 / под ред проф. С. Я. Гончаровой-Грабовской. Минск : РИВШ, 2010. С. 59–66.

4. *Олкотт Уильям.* Мифы о солнце / Пер. с англ. Н. Ю. Живловой. М.: ЗАО Центрполигриф, 2013.

5. *Дубоўка У.* Залатыя зярняты. Мінск: Мастацкая літаратура, 1975.